дазволіць стварыць дасканалае заканадаўства ў галіне рэстытуцыі. Вывучэнне заканадаўства іншых краін дапаможа выявіць яго хібы і недахопы, улічыць усе наступствы і пазбегнуць памылак пры стварэнні ўласнай заканадаўчай базы.

Неабходна памятаць аб тым, што ад стану культурных каштоўнасцей, якія складаюць нацыянальнае багацце дзяржавы, залежыць духоўнае развіццё і будучыня народа Беларусі.

### Літаратура


1. Юридический словарь. Авт.-сост. А. Азрилян, О. Азрилян. М., 2007.
2. *Ефремова Т. Ф.* Современный толковый словарь русского языка. // В III тт. М., 1996. Т. II.
3. Терминология проблем реституции // Вяртанне-3. Мн., 1996.
4. *Cummins Alissandra.* Universal Heritage Museum Partnerships // ICOM News. 2007. №1.
5. *Бриан Пьер.* Виртуальный и интерактивный музей Ахеменидов // Новости ИКОМ. 2006. №4.
6. *Judith Hook, Patrick Collinson.* The Sack of Rome. Palgrave Macmillan, 2004.
7. *Грицкевич В. П., Гужаловский А. А.* История музеев мира. Мн., 2003.
8. *Богуславский М. М.* Культурные ценности в международном обороте: правовые аспекты. М., 2005.
9. *Косьян Г. Н.* Мистической цепи звено. Реликвии венгерских королей // Антик Инфо. 2004. №4.
10. *Барчукова Н. К.* Конвенция ЮНИДРУА по похищенным или незаконно вывезенным культурным ценностям // Московский журнал международного права. 1996. №2.
11. *Ковальски В.* Репатриация культурных ценностей в ситуации уступок территории и распада многонациональных государств // Вяртанне-4. Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей: праблемы вяртання і суменсага выкарыстання (юрыдычныя, навуковыя і маральныя аспекты). Мн., 1997.
12. Пастанова Савета Міністраў РБ ад 16.01.2009 г. № 43 «Аб Камісіі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь па выяўленню, вяртанню, сумеснаму выкарыстанню і ўвядзенню ў навуковы і культурны ўжытак нацыянальных культурных каштоўнасцей, якія апынуліся за межамі Беларусі».


## ГРАМАДСКІЯ ЎЗАЕМААДНОСІНЫ Ў АСЯРОДКУ СЯЛЯНСКАЙ АБШЧЫНЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА ПАЛЕССЯ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX СТАГОДДЗЯ – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ


**Н. М. Карбалевіч**


Грамадская культура любога народа – гэта агромністы камунікатыўны досвед. Вывучэнне грамадскай культуры беларускага народа з’яўляецца актуальным у сучасным грамадстве, дзе з-за прымянення ўсё больш і

больш дасканалых электронных тэхналогіяў губляюцца традыцыі непасрэдных зносінаў. Досвед грамадскіх зносінаў беларускага сялянства з’яўляецца каштоўным унёскам у працэс развіцця нацыянальнай свядомасці беларускага грамадства, стварэння грамадзянскай супольнасці, забеспячэння трывалай сістэмы сацыяльнай абароненасці насельніцтва. З умоваў сумеснага існавання калектыву людзей вынікаюць featureнага кшталту формы ўзаемадачыненняў. Існуюць разнастайныя формы грамадскага суіснавання: бонда, сябрына, талака, здольніцтва, таварыства, што натуральна, улічваючы разнастайнасць жыццёвых сітуацыяў. Гэтыя формы адрозніваюцца па скіраванасці дзеянняў, зместу і форме існавання, сацыяльнаму складу ўдзельнікаў.

Калі паспрабаваць раскрыць значэнне слова «бонда» ў грамадскім кантэксце, у першую чаргу, неабходна мець на ўвазе маральны абавязак падзяліцца з блізкім прадуктам харчавання. Гэты звычай мае глыбокія карані, з’яўляецца дастаткова трывалым, гэта тлумачыцца адноснай нескладанасцю яго выканання. Больш за ўсё звычай распаўсюдзіўся на пчалярства – старадаўні занятак беларусаў. На Случчыне яшчэ ў пачатку XX стагоддзя, паводле сведчанняў беларускага этнографа А.К. Сержпутоўскага, «бонду» давалі нават тым, хто выпадкова праходзіў у час падрэзкі мёду каля пчольніка: «...існавала павер’е: калі хто не дась “бонды”, той сам ужо ніколі не будзе мець гэтага прадукту» [6, с.4]. Гэты прынцып традыцыйных узаемаадносінаў замацаваны ў народных уяўленнях і павер’ях, што ў пэўнай ступені садзейнічала кансервацыі грамадскіх адносінаў гэтага тыпу. «Бонда» таксама распаўсюджвалася і на іншыя пачастункі. «Так, напрыклад: калі хто-небудзь забівае кабана, дык звычай патрабуе даваць суседзям і ўвогуле аднавяскоўцам па кавалку свежага мяса ці сала –“бонду”» [6, с.4]. «Звычай раздаваць суседзям “бонды” распаўсюджваецца ў роўнай меры на злоўленую ў вялікай колькасці рыбу, забітых на паляванні звяроў і г.д.» [6, с.4].

Талака з’яўлялася формай узаемаадносінаў, заснаванай на сумеснай добраахвотнай бясплатнай працы ў дапамогу абшчыннiку, які талаку склікае. За працу ўдзельнікаў талакі часцей за ўсё частавалі ежаю і гарэлкаю. «У беларусаў вельмі распаўсюджаны звычай склікаць дапамогу, ці “талаку”, у час збору хлеба. На талаку склікаюць суседзяў з вечару, абяцаючы ім удосталь водкі, ці, як тут кажуць “гарэлкі”. Жанчынаў заклікаюць для жніва і выбару ільну, а мужчынаў – на касьбу, звозку з палёў хлеба і вывазку гною. Для апошняй работы сяляне з’язджаюцца да таго, хто іх паклікаў, з самага ранку, са сваімі сем’ямі і коньмі. Спачатку іх частуюць гарэлкаю і закускаю, а затым пачынаецца

дружная праца. Дарослыя мужчыны выграбаюць і накладаюць гной на драбіны, хлопчыкі і падлеткі адпраўляюцца з гэтымі драбінамі ў поле, там бабы і дзяўчаты размётваюць па ніве прывезенае ўгнаенне. І ў полі, і ў хлявах, і на двары – тлум, рух, говар, смех і песні» [9, с.12]. Як відно, талака была не толькі сумеснаю працаю, але і сродкам кантактавання паміж абшчыннікамі. Такім чынам, талаку склікалі, калі праца была неадкладнаю, як жніво, напрыклад, ці калі адна сям’я фізічна не магла з ёю справіцца, будаўніцтва хаты, напрыклад, ці калі здаралася няшчасце.

Сябрына ўяўляла сабой ужо не адзінкавае, няхай і перыядычнае дзеянне, а сістэму ўзаемаадносінаў у розных сферах. Тут ужо былі распрацаваныя правілы ўзаемаадносінаў, існавала сістэма павер’яў. «Слова сябер абазначае духоўную роднасць...» [8, с.1]. «Хоць пры ўладкаванні сябрыны ніякіх спецыяльных абраднасцяў не бывае, але з моманту яе з’яўлення сябры звяртаюцца адзін да аднаго на вы, а не на ты, як гэта прынята ўвогуле паміж чужымі просталюдзінамі» [8, с.2]. «Сябрына ўладкоўваецца як паміж сваякамі, так роўна і паміж чужымі, незалежна ад роднасці і сваяцтва» [8, с.1]. Утваралася сябрына часцей за ўсё неспадзяваным чынам. «Самы шчыры той сябер, якога дае сам Бог. Такім сябрам робіцца той чалавек, з кім у нас сядуць у вулей заедныя пчолы. Божую пчолку насілу да вулля не прыцягнеш, гэто ўжэ так Бог дае, калі яна ўвойдзе ў вулей» [7, с.144]. «Калі прадасі на гадоўлю якое-небудзь говедо й яно пойдзе ў руку, та той чалавек наш добры сябер» [7, с.144]. Як відно, заканамернасці ў грамадскіх адносінах звязаныя з гаспадарчымі дачыненнямі, што можна патлумачыць тым, што гаспадарка складала аснову жыцця селяніна і любыя падзеі, якія неслі станоўчы для гаспадаркі характар, набывалі магічную афарбоўку. Сведчаннем таго, што гэтая сістэма была эфектыўнай, можна лічыць тое, што існавалі і штучныя, наўмысныя шляхі стварэння сябрыны. «У нас на вяселлі маладым даруюць паўкаровы ці якога-небудзь жыўёла, паўкалоды пчол або што другое, каб быць сябрамі, бо чым больш сяброў, тым лягчэй жыць на свеце і ў радасці, і ў горы» [7, с.144].

Можна лічыць, што здольніцтва – гэта варыяцыя сябрыны. Але ёсць і пэўныя адрозненні. У існаванні здольніцтва ўжо амаль не існуе таго магічнага арэолу, які ёсць вакол сябрыны. У здольніцтве існуе сумеснае вядзенне ўсёй гаспадаркі, а не толькі яе пэўнай галіны, таму і заключаюцца больш трывалыя дамовы. Сябрына часцей за ўсё ўтвараецца неспадзявана – «боскім знакам», зольніцтва – праз свядомыя, мэтанакіраваныя дзеянні будучых здольнікаў. У такім выпадку здольніцтва можа быць формаю эвалюцыянавання сябрыны. Апісанні гэтай з’явы і гэтага кшталту назвы падае М.В. Доўнар-Запольскі. Ён

шырока ўжывае назвы «сямейная абшчына» і «штучная сямейная абшчына». Відавочна, што пад назваю «штучная сямейная абшчына» Доўнар-Запольскі апісвае форму грамадскага суіснавання грамады. Распавядаецца аб дамове ўдавы Параскоўі Рослік і яе здольніка Івана Трухана. У дамове адзначаецца, што здольнік павінен «глядзець за гаспадаркаю, як за ўласнаю»; «удаву паважаць, як старэйшую»; «малалетняга сына ўдавы выхоўваць да паўналецця, як свае ўласнае дзіця», выплочваць усе неабходныя павіннасці. Калі здольнік выканае ўмовы, дык пасля смерці ўдавы ён уступіць у роўныя правы валодання зямлёй з сынам удавы; калі ён пажадае сысці раней, яго ўтрымліваць не будуць, але ён згубіць права ўладання зямлёй» [2, с.88–90]. Як відно, здольнік меў не толькі эканамічныя, але і грамадскія абавязкі. «Мэта, якая злучае гэтыя штучныя сямейныя абшчыны, – гэта агульная праца...памаёмасныя адносіны адыгрываюць агромністую ролю ў такой сям'і. Не толькі рухомая маёмасць робіцца агульным здабыткам, але і зямля. Тэрмін дамовы...смерць аднаго з контрагентаў» [2, с.91]. Такі тэрмін дамовы гаворыць аб значнасці такой формы суіснавання ў сялянскім асяродку і аб важкасці прыняцця такога рашэння для селяніна. Такім чынам, здольніцтва з'яўлялася формай грамадскіх узаемаадносінаў, якая ажыццяўлялася адмыслова з мэтаю выправіць складанае гаспадарчае і сацыяльнае становішча сям'і.

Таварыства – забаўляльная форма юнацкіх сяброўскіх зносінаў, якая вынікала з сумесных інтарэсаў людзей аднаго ўзросту і аднаго грамадскага стану, якія жывуць на адной тэрыторыі. Калі гэты стан змяняецца, знікаюць падставы для цесных узаемаадносінаў. Часцей таварыства аб'ядноўвала нежанатых юнакоў, не абцяжараных хатнімі абавязкамі. «Хлопцы патуль таварышуюць, покуль пажэняцца, а там жонка-піла на шыі, дзеці да ўсялякі клопат, та тагды не да таварыства» [7, с.144]. Таварыства часцей за ўсё не выходзіла за межы юнацкіх адносінаў і знікала са зменаю сацыяльнага стану таварышоў. Потым яны пераходзілі да стварэння іншых, ужо больш складаных формаў грамадскіх узаемаадносінаў. «Покуль маладыя – таварышуюць, а як пажывуць да чорны вол наступіць на ногу, та й таварыство забудуць» [7, с.144]. Такім чынам, формы грамадскага суіснавання адрозніваліся варыятыўнасцю, дакладнаю адпаведнасцю сітуацыі, сацыяльнаму стану ўдзельнікаў, мэтамі і праблемамі, якія вырашаліся падчас іх ажыццяўлення.

Пры разглядзе такой грамадскай з'явы як сялянская абшчына не толькі з пазіцыяў эканамічных і гаспадарчых працэсаў вынікае, што сялянская абшчына гэта, перш за ўсё, сацыяльна-культурная, ментальная

з'ява, якая ў аснове сваёй мае не столькі эканамічныя падставы, колькі псіхічныя якасці людзей, якія пражываюць у тэрытарыяльным калектыве. Можна сцвярджаць, што адбыўся працэс пэўнага відазмянення ўзаемаадносінаў у абшчыне ў дачыненні да другой паловы XIX стагоддзя. Але гэтыя змены найбольш адбіваліся на форме, чым на змесце ўзаемаадносінаў. Грамада як сацыяльна-культурная з'ява працягвала існаваць і ў XIX стагоддзі, заснаваная на традыцыйнасці грамадскіх зносінаў, са значным механізмам рэгуляцыі грамадскай думкай.

## Літаратура


1. Беларусы. Т. 6: Грамадскія традыцыі. Мн.: Бел. навука, 2002.
2. *Довнар-Запольский М. В.* Очерки семейного обычного права крестьян Минской губернии // Этнографическое обозрение / Изд. О-ва любителей естествознания, антропологии и этнографии / Под ред. Н.А. Янчука. 1897. № 1. С. 82–142.
3. *Маракуев В. Н.* Полесье и полешуки: Из путевых записок: Чтение для школ. (Знакомство с отечеством, Вып. 1). М.: Тип. А. Клейн, 1879. Вып. 1.
4. *Пяткевіч Часлаў* Рэчыцкае Палессе / Уклад.; прадм. У. Васілевіча; пер. з пол. Л. Салавей і У. Васілевіча. Мн.: «Беларускі кнігазбор», 2004. («Беларускі кнігазбор»: Серыя 2, Гісторыка-літаратурныя помнікі).
5. *Сербов И. А.* Белорусы-сакуны. Краткий этнографический очерк. Петроград: Типография Академии наук, 1915.
6. *Сержпутовский А. К.* Бонда: Очерки Белоруссии // Живая старина. СПб., 1907. Вып. 3–4.
7. *Сержпутоўскі А. К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / Прадм. У.К. Касько; Маст. В.Р. Мішчанка. Мн.: Універсітэцкае, 1998.
8. *Сержпутовский А. К.* Сябрына: Очерки Белоруссии // Живая старина. СПб., 1907. Вып. 3–4.
9. *Сно Е. Э.* В болотах Полесья. СПб: Типография О.Н. Поповой, 1904.


# БЕРЕЗОВСКИЙ МОНАСТЫРЬ КАРТЕЗИАНЦЕВ: ПАМЯТНИК ИСТОРИИ И АРХИТЕКТУРЫ


**А. Е. Колбасина**


Береза – небольшой районный центр Брестской области. Через город течет речка Кречет, приток Ясельды, именно у ее истока стоят развалины древнего монастыря.

Свое имя Береза получила от названия монашеского ордена картезианцев (картузов), монастырь которого стал строиться в этом месте в 1648 году.

Основателем ордена картезианцев был св. Бруно, выходец из дворянского рода города Кельна. В 1084 году Бруно вместе с двумя единомышленниками основал пустынь на юге Франции в гористой